Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛІПЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 134 (28244)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Калі самыя родныя становяцца чужымі…



У Мінску ўвялі план «Пасейдон»

СТАР. 3



Па той бок прылаўка

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Магу сказаць, што ўжо 4,5 чалавека прэтэндуюць на месца ў парламенце ў гэтым папярэднім перыядзе вылучэння кандыдатаў. Аднак, думаю, колькасць ініцыятыўных груп зменшыцца, але пры гэтым павялічыцца колькасць тых, хто прыйдзе ад палітычных партый. Вылучэнне праз працоўныя калектывы — больш складаная форма вылучэння, а найбольш просты, выгадны і, у добрым сэнсе, рэкламны спосаб вылучэння — гэта, вядома, збор подпісаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0046 | ▲ |
| Еўра | 2,2148 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0808 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Славянскі. 25-ты. Юбілейны

**Сёння ўвечары адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»**




Фота БЕЛТА.

**Сёлета толькі ў афіцыйнай праграме каля 130 канцэртаў, шоу, спектакляў, праектаў. Фестываль №1 на постсавецкай прасторы стаў часовым і вельмі ўтульным домам для больш як 5,5 тысячы ўдзельнікаў аж з 44 краін.**

## КАНЦЭРТЫ З АНШЛАГАМІ

Першы сольны канцэрт у Летнім амфітэатры прайшоў пазаўчора. Пры поўным аншлагу выступіў Сяргей Лазараў. Самыя дарагія квіткі каштавалі 55 рублёў, самыя танныя — 25. Спявак прызнаўся журналістам, што ўпершыню пабываў на «базары» 20 гадоў таму — у складзе дзіцячага калектыву. І ўлюбіўся ў горад, гасціннасць і шчырасць беларусаў.

СТАР. 3

■ Правы спажыўца

# БУДАЎНІКІ СЫШЛІ, А НЕПРЫЕМНАСЦІ ЗАСТАЛІСЯ

## Як пазбегнуць праблем падчас рамонту?

**Пачынайце рамонт... з інтэрнэту, раяць спецыялісты. Сёння тут шмат інфармацыі пра будматэрыялы і рамонтныя работы. Пры жаданні можна па відэароліках нават навучыцца тынкаваць і класці плітку. З гэтай інфармацыяй варта азнаёміцца, нават калі вы будзеце наймаць майстроў. Тым, хто хоча сэканоміць, можна паспрабаваць сябе ў ролі прараба. Лепш узяць адпачынак і кантраляваць усе віды работ. Так вы пазбегнеце многіх праблем.**

### УСЁ ПАД КЛЮЧ?

Сёння багата майстроў, якія прапануюць свае паслугі. На жаль, сярод «рабацяг» шмат выпадковых людзей, якія могуць на вашай кватэры «папрактыкавацца» ў рамонтнай справе. Усё ж лепей не эканоміць, тым больш, калі вам не пашанцуе з выканаўцамі і справа дойдзе да суда, наўрад ці вы зможаце нешта спагнаць з прыватніка.

Ужо некалькі гадоў цягнуцца суды, звязаныя з трохпакаёвай кватэрай у сталічнай новабудоўлі, гаспадар якой узяў на працу ІПэшніка са стандартным пералікам работ, кшталту «ўсё пад ключ». Заказчык спраўна прыносіў грошы, пакуль не заўважыў, што не ўсё добра... Ён падаў у суд і выйграў. Цяпер работнік абавязаны аддаць 10 тысяч долараў, што яму былі заплачаны, плюс кошт дэмантажу і сапсаваных матэрыялаў. Як ён будзе вяртаць гэтыя грошы, ніхто не ведае. У ІПэшніка няма маёмасці, і прапісаны ён у бацькоў у іншым горадзе. Кватэра стаіць сапсаваная, гаспадар не можа заняцца яе рамонтам, таму што ў любы момант могуць спатрэбіцца паўторныя экспертызы.

СТАР. 4

■ Грошы

# Са спіса «дармаедаў» выкрэсліваюцца...

**У Міністэрстве па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтаваны змены ў дэкрэт кіраўніка дзяржавы №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». У праекце новага дакумента, які цяпер разглядаецца ў Адміністрацыі Прэзідэнта, прапануецца вызваліць ад аплаты спецыяльнага збору маці з дзецьмі да 10 гадоў, а таксама ўладальнікаў прысядзібных участкаў, незалежна ад прапіскі. Пра гэта і іншыя нюансы аплаты новага падатку расказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб МПЗ Ірына КРЫВАРОШЧАНКА.**

### Мае зваротную моц

Зараз ад выплаты падатку на дармаедства вызвалены шматдзетныя маці і тыя, хто выхоўвае дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, а таксама жанчыны, якія даглядаюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Яшчэ ў снежні кіраўніцтва падатковай галіны пачало агучваць свае прапановы аб увядзенні своеасаблівай «адтэрміноўкі» на тры гады па выплаце падатку на дармаедства для хатніх гаспадынь, якія нідзе не працуюць і выхоўваюць дзяцей. Вызваліць такіх жанчын ад збору збіраліся да таго моманту, пакуль малодшаму дзіцяці не споўніцца 10 гадоў. Аб планаваным новаўвядзенні было заяўлена, але ў дакументах яно зафіксавана не было.

Разам з маці ў новым дакуменце вызваліць ад падатку на дармаедства збіраюцца і людзей, якія маюць асабістыя падсобныя гаспадаркі. «Да нас часта сталі звяртацца людзі, якія маюць зямельны ўчастак, прызначаны для абслугоўвання жылога дома. Яны працуюць на гэтай зямлі, займаюцца раслінаводствам і не разумеюць, чаму павінны быць плацельшчыкамі збору», — тлумачыць сітуацыю намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення МПЗ. Згодна з прапановай падаткавікоў, праца на падсобнай гаспадарцы будзе ўлічвацца для ўсіх катэгорый нашых грамадзян, а не толькі тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці. Таму актыўныя дачнікі, верагодна, таксама не будуць плаціць падатак.

СТАР. 2